**Крывалап Аляксей Дзмітрыевіч**
Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў
e-mail: 2krivolap@gmail.com

# НАЦЫЯНАЛЬНЫ ХАРАКТАР ЯК ДАСЛЕДЧАЯ ПРАБЛЕМА

***Анатацыя.*** У артыкуле разглядаецца праблема разумення нацыянальнага характару у межах літаратуразнаўства і культуралогіі. Параўнанне праводзіцца па такіх крытэрыях як унутраны ці знешні позірк на сябе, разуменне ці адмаўленне траўматычнага досведу, стэрэатыпаў і ментальнасці нацыянальнага характару. Мэта артыкула – паказаць плённасць выкарыстання канцэпцыі культурнай ідэнтычнасці як культуралагічнага разумення нацыянальнага характару.

***Ключавыя словы:*** культурная ідэнтычнасць; практыка; нацыянальны характар; траўма; самаапісанне.

**Alexei Krivolap**
Belarusian State University for Culture and Arts
e-mail: 2krivolap@gmail.com

# NATIONAL CHARACTER AS A RESEARCH PROBLEM

***Abstract.*** The article examines the problem of understanding the national character within the framework of literary studies and cultural studies. The comparison is based on criteria such as an internal or external view of oneself, an understanding or denial of traumatic experiences, stereotypes and mentalities of a national nature. The aim of the article is to show the fruitfulness of using the concept of cultural identity as a cultural understanding of the national character.

***Keywords:*** cultural identity; practice; national character; trauma; selfdescription.

Часам варта пачынаць акадэмічнае падарожжа з правакацыйных пытанняў, каб мець магчымасць знайсці поле для даследаванняў і лепш зразумець магчымыя і наяўныя падыходы да той ці іншай даследчай праблемы. Чаму мы перакананы, што нацыянальны характар існуе? Так, геаграфія тлумачыць чаму падае дождж, астраномія – даказвае чаму Зямля круглая, фізіка – куды «знікае» цукар, калі яго дадаць у гарачую каву ці гарбату. Але як можна даказаць, што нацыянальны характар існуе? Якія тут могуць быць аргументы і якія дысцыпліны працуюць з нацыянальным характарам.

Пачнём з таго, што для літаратуразнаўцаў нацыянальны характар – гэта тое, што магчыма апісаць і зразумець. Для культуролагаў і сацыёлагаў – гэта запрашэнне да разважанняў пра культурную ідэнтычнасць і як практыку штодзённасці,

якую магчыма засвоіць, але вельмі складана зразумець. Некалькі прыкладаў з вынікаў літаратуразнаўчых даследаванняў. «Тэрмін «нацыянальны характар» увайшоў у навуковы ўжытак у беларускім літаратуразнаўстве параўнальна нядаўна. Дасюль часцей выкарыстоўваліся вызначэнні «душа народа», «дух народа» [3, с. 68]. Можна сказаць, што пытаннямі душы стала на працягу тысячагоддзяў займаецца псіхалогія, але досыць складана вызначыць кола носьбітаў душы і чым яны адрозніваюцца ад прадстаўнікоў іншых культур. Даследаванні творчасці пісьменнікаў спрыяе разуменню і вызначэнню гэтых ментальных утварэнняў. «Увогуле, нацыянальны характар можна коратка вызначыць як своеасаблівую сукупнасць розных псіхалагічных рыс і якасцей, уласцівых большасці прадстаўнікоў пэўнай нацыянальнай супольнасці. Асаблівасці нацыянальнага характару прама ці ўскосна адлюстроўваюцца ў найбольш распаўсюджаных рысах паводзінаў, пачуццяў і перажыванняў пераважнай часткі людзей, якія адносяцца да аднаго народа. Нацыянальны характар досыць устойлівы, стабільны, хоць з цягам часу пад уплывам розных фактараў можа набываць нейкія новыя рысы» [1, с. 203]. Але ўсё гэта можна сказаць і пра ідэнтычнасць, якая непазбежна трансфармуецца з цягам часу пад уплывам розных фактараў, што ў тэрмінах даследавання практыкі сведчыць пра сацыяльнае станаўленне асобы ў працэсе сацыялізацыі, а не біялагічны дэтэрмінізм па факце нараджэння.

Ці гэтага дастаткова, каб даказаць існаванне нацыянальнага характару? Магчыма, што ў межах культуралогіі і сацыялогіі культуры, можна разважаць пра культурную ідэнтычнасць, што для літаратуразнаўства будзе апісвацца як нацыянальны характар. Гэта як выпадак, калі з двух розных бакоў мы падыходзім да адной і той жа праблемы ці з'явы. Нешта падобнае ўжо адбывалася, калі фізікі і хімікі ў розныя часы «адкрылі» для сабе кісларод. Падрабязна гэта апісаў Томас Кун у «Структуры навуковых рэвалюцый» [2]. Магчыма, што для літаратуразнаўства, для мастацтвазнаўства – дзе ідэя нацыянальнага характару дастаткова прадуктыўна, таму што яна дазваляе аналізаваць этнічныя прыклады творчасці. Напрыклад, што пішуць пра былых белых каланізатараў, афрыканскія літаратары якія пераехалі з калоній у метраполію. Якім чынам яны спрачаюцца з назвамі, характарыстыкамі, адметнасцямі і інш. Але пры гэтым, калі мы выйдзем за межы літаратуразнаўства, то высветліцца, што гэта не факт, што існуе нацыянальны характар.

Таму ў якасці канструктыўнай прапановы магчыма паспрабаваць знайсці балючыя кропкі ў разуменні нацыянальнага характару, якія могуць дапамагчы вырывацца з гэтага замкнёнага кола. Сфармулюем тры прынцыповых пытання, без разумення і высвятлення адказы на якія, будзе вельмі складана разважаць пра нацыянальны характар:

1. Саманазвы і мянушкі. Усе характарыстыкі, з якімі сутыкаемся ў дачыненні да носьбітаў нацыянальнага характару – гэта характарыстыкі самаапісання ці саманазвы альбо гэта тое, што яны атрымоўваем звонку? Гэта вельмі бачна на прыкладзе

любой каланіяльнай і асабліва посткаланіяльнай літаратуры. Якое паходжанне маюць усе прапанаваныя формы і характарыстыкі носьбітаў нацыянальнага характару – гэта тое самае самаапісанне ці навязанае бачанне? І гэта не простае пытанне, на якое можна лёгка адказаць. Тут не будзе дробязей, нават сама мова для літаратара тут не зможа быць нейтральнай, а будзе падкрэсліваць адпаведнае стаўленне.

2. Культурная траўма. Калі тая ці іншая культура і нацыянальны характар разглядаюцца праз выкарыстанне нейкіх штампаў, што звязаны з пэўнымі сумнымі, драматычнымі падзеямі ў гісторыі: каланізацыя, рабства, войны... Не важна калі гэта здарылася, але і сёння ёсць тэмы, якія выклікаюць вельмі моцную эмацыйную рэакцыю, як рэакцыя на вынік гэтых сацыяльна-культурных траўм, якія людзі перажылі супольна. Напрыклад, гісторыя рабства для афраамерыканцаў, Другая сусветная вайна для еўрапейцаў і інш. Ад гэтага немагчыма адмахнуцца, таму што было даўно, мы зноў і зноў вяртаемся да гэтых падзей, але мы не можам нічога змяніць у мінулым. Неабходна не проста зразумець, што ёсць пэўная праблема, ад якой засталася траўма і мы павінны яе прапрацаваць. Разважанні ў тэрмінах нацыянальнага характару на гэту тэму не дазваляе прапрацаваць праблему, а наадварот, «цэментуе», фіксуе наяўны стан рэчаў, ператвараючы траўму ў непахісную праблему. І наадварот, гэта могуць быць спробы зразумець, пераадолець і прапрацаваць траўму. Прыняць мінулае і зразумець як з гэтым жыць далей. Калі мы сёння бачым рух Black Lives Matter у ЗША, то гэта сведчыць наколькі адчувальнай з'яўляецца праблема расавай няроўнасці.

3. Стэрэатып і менталітэт. Калі ўсё, што апісваецца ў літаратуразнаўчых працах і не толькі тлумачыцца праз стэрэатыпы і менталітэт, як праявы нацыянальнага характару. Набор словаў: стэрэатып, менталітэт і нацыянальны характар пры дасканалым чаргаванні, дазваляе быццам бы апісаць усё, але пры гэтым нічога не растлумачыць. Наколькі падобныя інтэрпрэтацыі адсылаюць да наяўных, а не фантомных рэферэнтаў у рэальнасці? Гэта можа быць проста навязаным і прыдуманым варыянтам інтэрпрэтацыі рэальнасці, які хутчэй аддаляе нас ад магчымасці наблізіцца да яе.

Такім чынам, гэтыя тры параметры: унутраны ці знешні позірк на сябе, разуменне ці адмаўленне траўматычнага досведу, стэрэатыпы і ментальнасць – могуць дапамагчы пры разуменні таго, што мы будзем ведаць пра нацыянальны характар. Калі мы разважаем пра апісанне той ці іншай культуры, то звяртаем увагу на разуменне лакальных праблем. Гэта тая класічная постаць маленькага чалавека ў буйных абставінах, усё гэта можам бачыць праз дробныя праявы штодзённасці. Фактычна, гэта тое, якім чынам грамадства пражывае дзень за днём, якім чынам выбудоўваецца ўласная гісторыя. Гісторыя сваёй сям'і, месца дзе жывём, горад, раён і толькі потым пачынаюцца нейкія вялікі ўзроўні ідэнтычнасці як рэгіён і краіна. Але ўсё пачынаецца са штодзённай практыкі і што самае цікавае,

менавіта гэта самая практыка, маленькія справы кожны дзень. Напэўна гэта таксама нешта расказвае пра нас Іншым.

Высновы, ці што з гэтым можна рабіць далей. Калі мы кажам пра літаратуразнаўства, то безумоўна канцэпцыя нацыянальнага характару працуе і дазваляе даследаваць творчасць літаратараў. З іншага боку, на гэтую ж самую з'яву можна паглядзець культуралагічна, праз штодзённыя практыкі жыцця маленькага чалавека, якія сведчаць, што гэта не адзіны і непаўторны варыянт (калі гэта толькі не апісанне жыцця вар’ята). Калі гэта не дэвіянтныя паводзіны, то гэта апісанне таго самага нацыянальнага характару, які мы часам ведаем як культурную ідэнтычнасць за якую мы павінны змагацца, нешта прыдумваць, даказваць самім сабе. Гэта дакладна не тое, што мы можам, як атрымаць раз і назаўжды. Культурная ідэнтычнасць – гэта не стан, а працэс, няспыннае сацыяльнае станаўленне. Калі прыналежнасць да той ці іншай культуры не вызначаецца па факце нараджэння, а праз няспынную працу над сабой.

## СПІС ЛІТАРАТУРЫ

1. Дубовік, А. І. Асаблівасці нацыянальнага характару беларусаў / А. І. Дубовік // XXI век: актуальные проблемы исторической науки : материалы междунар. науч. конф., посвящ. 70-летию ист. фак. БГУ. Минск, 15–16 апр. 2004 г. – Минск : БГУ, 2004. – С. 203–205.
2. Кун, Т. Структура научных революций / Т. Кун. – М. : АСТ, 2009. – 317 с.
3. Навумовіч, У. А. Нацыянальны характар беларуса ў аповесцях Янкі Брыля / У. А. Навумовіч // Веснік БДУ. – Сер. 4. –2006. – № 2. – С. 68–72.